*І. А. ЧУПРАКОВА*

# ФАРМІРАВАННЕ ПРАВАВОЙ КУЛЬТУРЫ ПАДЛЕТКАЎ У БІБЛІЯТЭЦЫ ЯК ПЕДАГАГІЧНАЯ ПРАБЛЕМА

*Артыкул прысвечаны сацыяльна-педагагічным аспектам праблемы фарміравання прававой культуры падлеткаў як аднаму з сацыяльна абгрунтаваных напрамкаў бібліятэчна-бібліяграфічнага абслугоўвання на сучасным этапе. Мэтай публікацыі з'яўляецца раскрыццё тэарэтыка-метадычных пытанняў дзейнасці бібліятэкі па фарміраванні прававой культуры падлеткаў. Прапанавана мадэль рэалізацыі бібліяпедагагічнай дзейнасці праз раскрыццё канцэптуальных пазіцый, мэты і задач, а таксама змястоўнага, арганізацыйна-дзейнаснага, метадычнага і рэзультатыўнага кампанентаў педагагічнага працэсу, што ляжыць у аснове азначанай дзейнасці.*

З улікам тэндэнцый сучаснай рэальнасці дзейнасць бібліятэкі як інстытута сацыялізацыі імкнецца адпавядаць сацыяльным чаканням і аб'ектыўным патрабаванням грамадства ў кірунку фарміравання сацыяльна значных якасцей і індывідуальнай сістэмы каштоўнасцей асобы, якая адпавядае сацыякультурным, эканамічным, інфармацыйным умовам і забяспечвае сацыяльна прымальныя паводзіны ў грамадстве. Прававая культура асобы як адна з такіх якасцей і частка духоўнай культуры з'яўляецца неабходнай умовай сацыялізацыі чалавека, фарміравання яго сацыякультурных арыентацый. У гэтай сувязі распрацоўка тэарэтыка-метадычных асноў дзейнасці бібліятэк па фарміраванні прававой культуры асобы вылучаецца як адна з актуальных праблем бібліятэчнай справы, якая патрабуе шматаспектнага асэнсавання ў сацыяльна-педагагічным аспекце.

Дыскусія наконт ролі, статусу і стратэгіі бібліятэкі ў сучасных сацыяполікультурных умовах засяроджвае ўвагу на гуманізме як светапоглядной аснове дзейнасці бібліятэчнага сацыяльнага інстытута, які сцвярджае чалавека як вышэйшую каштоўнасць, прызнае яго права на ўсебаковае развіццё і праяўленне здольнасцей. Такая канцэптуальная вызначанасць акцэнтуе ўвагу на духоўнай культуры асобы, яе самаразвіцці, самаўдасканаленні, раскрыцці ўнутранага патэнцыялу і яго актывізацыі, стымуляванні аналітычных, канструктыўна-крытычных адносін да рэчаіснасці.

Адпаведна гэтаму значным становіцца раскрыццё ролі бібліятэкі як транслятара агульнагуманістычных каштоўнасцей у задавальненні патрэбнасцей карыстальнікаў, развіцці іх інфармацыйных, адукацыйных, культурна-адпачынкавых і іншых патрэбнасцей. Тым самым бібліятэка садзейнічае развіццю асобы, узвышае духоўны патэнцыял чалавека праз чытанне як адзіную інтэлектуальную тэхналогію засваення накопленых грамадствам ведаў. Паводле С. А. Басава, бібліятэка не толькі можа, але і павінна ўздзейнічаць на культурны, адукацыйны і грамадзянскі патэнцыял асобы [2, с. 28], што экспліцыруецца праз узмацненне ўвагі да псіхолага-педагагічнага сэнсу і зместу бібліятэчнай дзейнасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Пацвярджэннем таму з’яўляецца вялікая колькасць публікацый у прафесійным бібліятэчным друку, дзе абмяркоўваюцца пытанні пераадолення стыхійнай сацыялізацыі асобы, стварэння ўмоў для яе самаразвіцця, самарэалізацыі, самаактуалізацыі і праяўлення здольнасцей, развіцця і ўдасканалення асобасных якасцей бібліятэчна-бібліяграфічнымі сродкамі. Значную ролю ў такім уплыве на чытача адыгрываюць непасрэднае і апасродкаванае псіхолага-педагагічнае ўзаемадзеянне бібліятэкара з карыстальнікам праз спецыяльна падабраныя і сфарміраваныя інфармацыйныя рэсурсы, мэтанакіравана арганізаванае бібліятэчнае асяроддзе, сістэму інфармацыйных прадуктаў і паслуг. Важнейшым элементам педагагічнага працэсу ў бібліятэцы з’яўляюцца міжасобасныя зносіны [5, с. 45], якія ляжаць у аснове сумеснай сацыякультурнай дзейнасці бібліятэкара і карыстальніка, і менавіта такая дзейнасць, па словах А. С. Басава, ператварае чалавека ў паўнавартасную асобу [2, с. 31].

Сутнасць бібліятэчна-педагагічнай дзейнасці раскрываецца ў працах айчынных бібліятэказнаўцаў Л. А. Дзямешкі, Н. У. Клімянковай, С. А. Паўлавай [3; 4; 5]. Даследуючы педагагічныя праблемы бібліятэчнай справы, беларускія вучоныя акцэнтуюць увагу на неабходнасці педагагічнага асэнсавання праблем узаемадзеяння і ўзаемнага ўплыву бібліятэкі і карыстальніка, заклікаюць педагагічную супольнасць праявіць увагу да чытання як асобасна-значнай духоўнай дзейнасці, сродку засваення культуры і фарміравання асобы, інструмента вучэбна-пазнавальнай актыўнасці.

Фарміраванне прававой культуры насельніцтва з’яўляецца адным з сацыяльна абгрунтаваных прыярытэтных напрамкаў бібліятэчна-бібліяграфічнага абслугоўвання [3, с. 31; 5, с. 47; 8, с. 179; 9, с. 122], які знаходзіць апору ў адпаведнай галіне педагогікі. Таму ў аснове гэтай дзейнасці ляжыць педагагічны працэс выхавання прававой культуры асобы, які прадстаўляе сабой сістэму ўзаемазвязаных і паслядоўных узаемадзеянняў усіх яго ўдзельнікаў. Такая сістэма падпарадкавана адпаведнай мэце, канцэптуальным пазіцыям і ўключае змястоўны, арганізацыйна-дзейнасны, метадычны і рэзультатыўны кампаненты. У бібліятэчным асяроддзі адзначаны працэс мадыфікуецца і набывае пэўныя адметнасці, уласцівыя спецыфіцы бібліятэчнага абслугоўвання. У шэрагу апошніх выступаюць спантанны характар зносін (кароткачасовасць і эпізадычнасць кантактаў бібліятэкара з чытачом), якія ў большай ступені нагадваюць імправізацыю, адсутнасць прымусу, максімальная скіраванасць да індывідуальнага падыходу як «найбольш эмацыянальна насычанага і дзейнаснага канала ўздзеяння» [6, с. 48] падчас абслугоўвання карыстальнікаў.

*Мэтавыя арыенціры* вызначаюць задачы фарміравання прававой культуры чытачоў-падлеткаў з улікам іх узроставых асаблівасцей, псіхалагічных новаўтварэнняў і сацыяльнай сітуацыі развіцця. У прафесійным друку адзначаецца, што асаблівай увагі ва ўмовах тэндэнцый дэзаксіялагізацыі культуры і крыміналізацыі падрастаючага пакалення патрабуюць менавіта падлеткі. Айчынныя даследчыкі Т. С. Будніцкая, Г. А. Зублеўская, Г. А. Васілевіч, В. Э. Схопчык, В. П. Шыянок, Н. М. Юрашэвіч, А. М. Яфрэменка канстатуюць пэўныя адхіленні ад нормы маральна-прававой сферы падлеткаў, сярод якіх называюць дэфармаваную правасвядомасць,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

схільнасць да дэвіянтных паводзін, амаральныя ўстаноўкі, павышаную канфліктнасць, прававыя нігілізм, інфантылізм і цынізм.

Немалаважнай у дапаўненне вышэйадзначанага з’яўляецца адна з заканамернасцей працэсу прававой сацыялізацыі асобы, абгрунтаваная сацыёлагамі М. Аруцюнян, В. Здравамыславай і Ш. Курыльскім-Ажвэнам. Даследчыкі даказалі, што сістэма першапачатковых прававых прадстаўленняў, вобразаў права і прававых каштоўнасцей закладваецца ў перыяд дзяцінства і падлеткавасці, сталее ў юнацтве і аказвае сутнасны ўплыў на фарміраванне светапогляднай пазіцыі асобы, бо становіцца асновай адпаведных рэпрэзентацый дарослага і валодае пэўнай прадказальнай сілай далейшай эвалюцыі чалавека [1]. З улікам гэтага фарміраванне «вобраза» і «вопыту» права мае вызначальны сэнс менавіта ў падлеткавым узросце.

Бібліятэчнай сацыялогіяй вызначана ўзроставая дыферэнцыяцыя чытацкіх груп [4, с. 21], заснаваная на асаблівасцях развіцця дзяцей і падлеткаў, максімальным уліку індывідуальных патрэбнасцей і чытацкіх інтарэсаў асобы, на ступені сфарміраванасці культуры чытання. Названыя і іншыя параметры ляжаць у аснове педагагічна карэктнага развіцця інфармацыйных, культурных і іншых патрэбнасцей юных чытачоў, сацыяльна-педагагічнага ўздзеяння на фарміраванне пэўных асабістых якасцей. У адпаведнасці з адзначанай узроставай дыферэнцыяцыяй менавіта чытачоў малодшага падлеткавага ўзросту (10–11 гадоў) мэтазгодна разглядаць як аб’ект бібліяпедагагічнага ўздзеяння з мэтай фарміравання прававой культуры, улічваючы, што менавіта гэты ўзрост з’яўляецца сензітыўным для прававой сацыялізацыі асобы.

*Канцэптуальнай асновай* фарміравання прававой культуры асобы падлетка ў бібліятэцы выступае педагогіка супрацоўніцтва. Яна дазваляе максімальна карэктна ўплываць на фарміраванне і развіццё яго асобасных уласцівасцей і якасцей у працэсе чытання і камунікацыі з улікам асаблівасцей чытацкага развіцця разглядаемай катэгорыі карыстальнікаў. Канцэптуальныя пазіцыі праектавання і рэалізацыі педагагічнага працэсу фарміравання прававой культуры чытачоў-падлеткаў вызначаюць таксама прынцыпы і падыходы. Сярод апошніх вылучаюць акмеялагічны, аксіялагічны, асобасна арыентаваны, герменеўтычны, дзейнасны, кампетэнтнасны і сістэмны.

Пастаноўка пытання пра *змястоўны кампанент* сацыяльна-педагагічнага ўплыву бібліятэкі на асобу падлетка з мэтай фарміравання прававой культуры патрабуе разгляду сутнасці і структуры апошняй як яе ўнутранай арганізацыі. Абапіраючыся на педагагічныя даследаванні прававой культуры навучэнцаў, прадстаўленыя працамі айчынных і расійскіх навукоўцаў А. Т. Зямновай, Л. М. Мацвіенкі, С. В. Міронавай, Т. А. Парафіяновіч, І. А. Царык, Н. І. Эліясберг і іншых, мы прапануем разумець прававую культуру чытача-падлетка як актуальную інтэгратыўную якасць асобы, якая характарызуецца наяўнасцю прававых ведаў, сфарміраванасцю маральна-прававых каштоўнасцей, установак і перакананняў, правамернымі паводзінамі і сацыяльна-прававой актыўнасцю.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У змест прававой культуры ўваходзяць і інфармацыйныя якасці асобы, звязаныя з індывідуальнай інфармацыйнай дзейнасцю ў сферы права. Такімі якасцямі з’яўляюцца разуменне сутнасці і прызначэння прававой інфармацыі ў грамадстве, веданне крыніц прававой інфармацыі і інфармацыйна-прававых рэсурсаў, усвядомленыя матывы і патрэбнасць звароту да прававой інфармацыі, а таксама ўменні і навыкі пошуку і работы з прававой інфармацыяй і інфармацыйна-прававымі рэсурсамі. Значным у гэтай сістэме з’яўляецца фарміраванне ведаў пра бібліятэку як цэнтр прававой інфармацыі, яе дзейнасць па прадастаўленні бесперашкоднага доступу да прававой інфармацыі ўсім катэгорыям насельніцтва.

Кампанентны склад прававой культуры асобы рэпрэзентаваны сацыяльна-прававымі прадстаўленнямі, прававымі ведамі, пачуццямі, каштоўнасцямі, матывамі, устаноўкамі, правамернымі паводзінамі і актыўнасцю асобы ў сферы права. Гэта сведчыць пра наяўнасць інтэлектуальнай асновы, эмацыянальнага і паводзінскага складнікаў у яе структуры. Беларуская даследчыца І. А. Царык разглядае апошнія як кагнітыўны, эмацыянальна-ацэначны і паводзінскі кампаненты [10, с. 6]. Н. І. Эліасберг прадстаўляе структуру прававой культуры кагнітыўным, эмацыянальна-валявым і паводзінскім кампанентамі [11, с. 25], Л. М. Мацвіенка вылучае кагнітыўны, матывацыйна-ацэначны і дзейнасны кампаненты [7, с. 8]. Прымаючы да ўвагі юрыдычныя даследаванні прававой культуры А. А. Бачкова, А. А. Зорчанка, Р. У. Краўцова, В. П. Сальнікава, Т. В. Сінюковай, А. В. Лукашавай, а таксама сацыялагічныя даследаванні Т. В. Муслумавай, В. С. Дзямко, Ю. А. Зубок, У. І. Чупрова, прапануем разглядаць структуру прававой культуры чытача-падлетка як адзінства кагнітыўнага, каштоўнасна-матывацыйнага і дзейнаснага кампанентаў.

Названыя кампаненты выступаюць як узаемазалежныя і ўзаемадзейнічаючыя складнікі ў іх недзялімай цэласнасці і прадстаўляюць сабой унікальны і рухомы комплекс пэўных сутнасных прыкмет, якія абумоўліваюць сацыяльную каштоўнасць чалавека. Веданне зместу гэтых складнікаў, а таксама спецыфікі іх развіцця выступае неабходнай умовай мэтанакіраванай бібліяпедагагічнай дзейнасці па фарміраванні прававой культуры падлеткаў, паколькі дазваляе ажыццяўляць граматнае і педагагічна карэктнае ўздзеянне на кагнітыўную, эмацыянальную і паводзінскую падструктуры асобы падчас ажыццяўлення чытацкай дзейнасці, бібліятэчных зносін як інфармацыйнага і прадметнага ўзаемадзеяння. Такім чынам, адзначаныя вышэй сутнасныя характарыстыкі прававой культуры падлеткаў, як і разуменне зместу гэтай інтэгратыўнай якасці, дазваляюць рэалізаваць змястоўны кампанент працэсу фарміравання прававой культуры падлеткаў.

*Арганізацыйна-дзейнасны* кампанент мае ўвасабленне праз выбар суб’ектаў, здольных ажыццяўляць фарміраванне прававой культуры на аснове сацыяльна-педагагічнага патэнцыялу бібліятэкі. Такімі суб’ектамі з’яўляюцца публічныя бібліятэкі, у тым ліку дзіцячыя, а таксама школьныя бібліятэкі, карыстальнікі якіх – падлеткі 5–6 класаў. Вырашэнне пастаўленых задач патрабуе ад бібліятэкі арганізацыі і развіцця сацыяльнага партнёрства з дзяржаўнымі органамі ўсіх узроўняў, суб’ектамі прававой



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

асветы насельніцтва, грамадскімі аб'яднаннямі і таварыствамі, а таксама ўзаемадзеяння з бацькамі, педагогамі і выхавальнікамі.

У названы кампанент уваходзіць і арганізацыя матэрыяльна-прасторавага асяроддзя бібліятэкі, зарыентаванага на дасягненне пастаўленай мэты. Такое асяроддзе з'яўляецца праваразвіваючым, бо выступае як пэўная мадэль грамадства. Чытач-падлетак тут выступае свабодным паўнапраўным суб'ектам з адпаведным сацыяльным статусам, які не толькі валодае правамі і абавязкамі, але і рэалізуе іх.

Праваразвіваючае асяроддзе базіруецца на змесце і форме прававых адносін асобы з бібліятэкай і знаходзіць канкрэтнае ўвасабленне ў правілах карыстання бібліятэкай. У працэсе інфармацыйна-бібліятэчнага абслугоўвання ўзнікае цэлы шэраг грамадскіх адносін, якія падлягаюць прававому рэгуляванню. Сярод іх вылучаюцца адносіны наконт забеспячэння канстытуцыйнага права грамадзян на пошук і атрыманне інфармацыі, выканання норм аўтарскага права ў працэсе прадастаўлення інфармацыйных паслуг, забеспячэння бібліятэкай належнай якасці прадуктаў і паслуг.

Карыстальнік бібліятэкі перш за ўсё знаёміцца, усведамляе змест і сутнасць прававых норм і правілаў, якія вызначаюць аснову стасункаў бібліятэкі і чытача, рэгулююць адносіны ў працэсе бібліятэчна-інфармацыйнага абслугоўвання. Такім чынам, сам працэс знаходжання ў бібліятэцы, стасункі з бібліятэкарам, карыстанне інфармацыйнымі рэсурсамі заснаваны на рэгламентаваных правілах, абавязковых для ўсіх і кожнага.

Рэалізацыя арганізацыйна-метадычнага кампанента немагчыма без уключэння падлеткаў у розныя віды дзейнасці, у тым ліку сумесныя з бібліятэкарам: чытацкую, пошук і выбар інфармацыі, гульнявую, самаадукацыйную і інш. Прадуктыўным у гэтым кірунку з'яўляецца стварэнне ўмоў для ўключэння чытачоў у сацыяльную практыку, дзе яны змогуць прымяніць набытыя веды і ўменні, выпрацаваць навыкі іх выкарыстання ў сваіх штодзённых справах. Напрыклад, у бібліятэцы падлетак знаёміцца з прававой інфармацыяй і адрознівае яе ад іншых відаў інфармацыі, набывае вопыт работы з ёю. Карыстальнік вучыцца распазнаваць віды прававых актаў, працаваць з друкаванымі крыніцамі прававой інфармацыі і інфармацыйна-прававымі рэсурсамі. Чытач спрабуе правільна ўсведамляць і перарабляць прававую інфармацыю, знаходзіць у тэксце прававога акта не толькі патрэбную прававую норму, але і правільна спасылацца на яго падчас вуснай ці пісьмовай камунікацыі.

*Метадычны кампанент* мае на мэце адбор і выкарыстанне прадуктыўных форм, метадаў і сродкаў бібліятэчнай дзейнасці для фарміравання і гарманічнага развіцця ўсіх кампанентаў прававой культуры ў іх адзінстве. Так, бібліятэка здольная рэалізаваць як кароткачасовыя, так і доўгатэрміновыя формы работы з падлеткамі. У першым выпадку такая работа мае выгляд тэматычнага мерапрыемства, гадзіны прававой інфармацыі, дня прававой інфармацыі, урока прававых ведаў, літаратурнага падарожжа, у другім – афармляецца ў сацыяльна-педагагічны праект, мэтавую праграму, школу прававых ведаў, гурток або клуб па інтарэсах, чытацкае аб'яднанне і інш.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Выбар сродкаў і метадаў падпарадкаваны дасягненню пастаўленых задач, таму бібліятэкар можа на свой выбар скарыстаць гучнае чытанне і абмеркаванне прачытанага, тэматычную выставу літаратуры, агляд літаратуры пра правы дзіцяці, кансультаванне, інфармаванне, гутарку-кансультацыю, гульню, кніжнае падарожжа, крыжаванку, віктарыну і іншыя інструменты, прызначаныя паўплываць на свядомасць, эмоцыі і дзейнасць чытача-падлетка.

*Рэзультатыўны кампанент* характарызуе ступень дасягнення бібліятэкай пастаўленай мэты. Ён уключае дыягностыку сфарміраванасці прававой культуры падлеткаў і ацэнку рэзультатаў паспяховасці сацыяльна-педагагічнай дзейнасці бібліятэкі ў гэтым кірунку.

Дыягностыка служыць інструментам для выяўлення ўзроўню сфарміраванасці кагнітыўнага, каштоўнасна-матывацыйнага і дзейнаснага кампанентаў з дапамогай пэўных крытэрыяў і паказчыкаў. Яе рэзультаты дазваляюць бібліятэкару выявіць узровень сфарміраванасці прававой культуры падлеткаў і вызначыць вектар далейшай работы з чытачом або групай у развіцці найбольш «слабага» кампанента. Сярод дыягнастычных методык, якія ўжываюцца ў педагогіцы з адпаведным прызначэннем, найбольш прыдатнымі для выкарыстання ў бібліятэцы з'яўляюцца гутарка, анкетаванне, тэсціраванне.

Разам з тым дыягностыка з'яўляецца інструментам ацэнкі бібліяпедагагічнай дзейнасці, а таксама адным з фактараў удасканалення і аператыўнай карэкцыі педагагічнага працэсу фарміравання прававой культуры падлеткаў.

Такім чынам, сацыяльна-педагагічная дзейнасць бібліятэкі па фарміраванні прававой культуры чытачоў-падлеткаў прадстаўляе сабой арганізаваную сістэму ўзаемазвязаных і паслядоўных узаемадзеянняў, а таксама ўзаемаўплыву бібліятэкі і карыстальніка. Інфармацыйныя, інтэлектуальныя і матэрыяльныя рэсурсы бібліятэкі, яе інфармацыйна-адукацыйнае асяроддзе, тэхналогіі, кваліфікаваныя кадры і іх інфармацыйна-прававая культура, сацыяльнае партнёрства і шматгадовы вопыт прааасветніцкай дзейнасці выступаюць тым спецыфічным патэнцыялам бібліятэчнай сацыяльнай установы, арганічная інтэграцыя якога з педагагічнай тэорыяй фарміравання прававой культуры асобы здольная даць значны эфект ва ўкараненні прававой культуры чытачоў малодшага падлеткавага ўзросту.

1. *Арутюнян, М. Ю.* Образ и опыт права. Правовая социализация в изменяющейся России / М. Ю. Арутюнян, О. М. Здравомыслова, Ш. Курильски-Ожвэн. – М. : Весь мир, 2008. – 208 с.

2. *Басов, С. А.* Библиотека в контексте цивилизации и культуры / С. А. Басов // Библиотековедение. – 2010. – № 1. – С. 25–32.

3. *Дзямешка, Л. А.* Бібліятэказнаўства і бібліятэчная справа : педагагічны аспект / Л. А. Дзямешка, Н. У. Клімянкова, С. А. Паўлава // Адукацыя і выхаванне. – 2011. – № 3. – С. 27 – 32.

4. *Дзямешка, Л. А.* Дзейнасць бібліятэкі як сацыяльнай установы / Л. А. Дзямешка, С. А. Паўлава // Сацыяльна-педагагічная работа. – 2008. – № 8. – С. 20–24.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*5. Клімянкова, Н. У.* Бібліятэчна-педагагічная дзейнасць: напрамкі развіцця / Н. У. Клімянкова // Адукацыя і выхаванне. – 2009. – № 12. – С. 44–49.

*6. Коломинский, Я. Л.* Актуальные социально-психологические проблемы изучения педагогического взаимодействия / Я. Л. Коломинский // История психологии в Беларуси : хрест. / авт.-сост.: Л. А. Кандыбович, Я. Л. Коломинский. – Минск : Тесей, 2004. – С. 40–54.

*7. Матвиенко, Л. М.* Правовое воспитание старшеклассников в процессе изучения дисциплин гуманитарного цикла : автореф. дис. … канд. пед. наук: 13.00.01 / Л. М. Матвиенко. – Волгоград, 2004. – 28 с.

*8. Матлина, С. Г.* Публичная библиотека: пути инновационного развития : избранное / С. Г. Матлина. – СПб. : Профессия, 2009. – 376 с.

*9. Мелентьева, Ю. П.* Социально обоснованные приоритетные направления библиотечного обслуживания / Ю. П. Мелентьева // Библиотечное обслуживание : учебник / Ю. П. Мелентьева. – М. : ФАИР, 2006. – С. 120–147.

*10. Царик, И. А.* Воспитание правовой культуры школьников / И. А. Царик // Сацыяльна-педагагічная работа. – 2008. – № 5. – С. 3–9.

*11. Элиасберг, Н. И.* Система этико-правового образования школьников. Петербургская модель / Н. И. Элиасберг // Российская конференция информационно-правовых центров для детей и подростков «Петербургская модель этико-правового образования школьников», Санкт-Петербург, 25–27 нояб. 2002 г. / сост.: В. К. Кузнецова, Ю. В. Ершова. – СПб. : ЦДГБ, 2003. – С. 24–29.


*I. CHUPRAKHOVA*

**FORMING OF JIVENILE LEGAL CULTURE AS THE PEDAGOGICAL PROBLEM IN LIBRARY ACTIVITY**

*The article deals with the theoretical and methodological aspects of library activities in the sphere of juvenile legal culture. The aim of the article is to reveal the theoretical and methodological problems of library activity in developing of juvenile legal culture. A new model of realization of such library-pedagogical activity, its goals and objectives, as well as the comprehensive, organizational and methodological components are investigated.*

Дата паступлення артыкула ў рэдакцыю: 04.06.2012.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ